ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

11 кастрычніка 1931 г.
№ 238 (1506)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Да кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б

ЭНТУЗІЯЗМ НЯ ВЕДАЕ МЕЖ

Комсамольская організацыя Аршанскага вузла перабудоўвае сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі

Абгаварэньне адозвы партыйна-комсамольскага і профэсыйнага актыву Аршанскага вузла сярод рабочых па цэхах, брыгадах і зьменах выклікала новую хвалю энтузіязму рабочых. На сходах вынесіліся сустрэчныя прапановы к адозьве. Організуюцца новыя ўдарныя брыгады ў знак сустрэчы кастрычнікавага пленуму ЦК КПбБ.

Уся работа разгорнута пад кутом погляду рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна.

У дэпо Ворша організаваны дзьве новыя ўдарныя брыгады імя 14 гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі. Адна брыгада організавана з арматуршчыкаў пад кіраўніцтвам тав. Жука, а другая—пад кіраўніцтвам тав. Вялічкі. Абедзьве брыгады пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

У сувязі з падрыхтоўкай да пленуму ЦК КПбБ, узмацніўся прыток у рады партыі і комсамолу.

Пры абгаварэньні адозвы ў брыгадзе кацельшчыкаў, гарнітуршчыкаў, выпадковага рамонту пададзена ў партыю 10 заяў. Грузчыкі станцыі Ворша абвясьцілі кастрычнік месяц ударным. 15 чалавек падалі заяву ў партыю.

Зьмена старшага памочніка начальніка станцыі Ворша тав. Рыжова пры абгаварэньні адозвы высунула сустрэчную лічбу—перавыканаць паказаныя ў адозьве лічбы-вымернікі на 5 пр.

У адказ на тэлеграму ЦК КПбБ аб ліквідацыі прарыву ва ўборцы бульбы, лепшыя ўдарнікі гэтай брыгады абвясьцілі сябе мобілізаванымі на ліквідацыю гэтага прарыву.

Сем асоб з гэтай брыгады падалі заявы аб прыняцьці іх у рады партыі.

Кацельная, экіпажная, дышлавая і інш. брыгады дэпо пастанавалі к пленуму ЦК КП(б)Б і 14 гадавіне Кастрычніка адпрацаваць зьверх пляну адзін дзень па выпуску з рамонту паравоза. Гэтыя брыгады выклікалі на соцспаборніцтва іншыя брыгады дэпо.

У брыгадах організаваны чатыры штодзёнкі—„За работу па-новаму“.

Асаблівы энтузіязм выклікала распрацоўка адозвы сярод комсамоліі вузла Новым папаўненьнем сваіх радоў, перадачай у партыю лепшых ударнікаў-комсамольцаў, новымі ўдарнымі брыгадамі, перавядзеньнем брыгад на гаспадарчы разрахунак адказваюць маладыя бальшавікі на адозву. Так, за першыя два дні абгаварэньня адозвы ў комсамол пададзена 19 заяў. Комсамольскі колектыў вузла ў асноўным акомсамолены.

45 лепшых ударнікаў-комсамольцаў перададзены ў партыю.

9 маладзёжна-комсамольскіх брыгад пераводзяцца на гаспадарчы разрахунак. Організавана новых 9 ударных комсамольскіх брыгад імя 14 гадавіны „Кастрычніка і „Чырвонай Зьмены“. Комсамолія вузла ўзяла на сябе абавязак к пленуму адрамантаваць звыш пляну 3 паравозы і два вагоны. Організуецца новая ўдарная комсамольская брыгада на маноўравым паравозе імя „Чырвонай Зьмены“.

Організавана скразная комсамольская брыгада па выкапцы вялікага катлавану для фабрыкі-кухні. За першыя два дні пададзена 17 рацыяналізатарскіх прапаноў.

Організаваны дзьве плянава-опэрацыйныя групы.

Комсамольскія ячэйкі ўстанавілі сутачныя кантрольныя пасты па прасоўваньню асеньня-зімовых грузаў. У адказ на тэлеграму ЦК КП(б)Б аб адгрузцы бульбы комсамолія вузла абавязваецца організаваць і завезьці сваімі сіламі тры эшалёны бульбы для пролетарыяў Ленінграда і Масквы. Першы эшалён гатоў і адпраўляецца 10 кастрычніка ў Ленінград.

Ударная брыгада „Зьвязды“ і „Чырвонай Зьмены“—
Гафт, Пракаповіч, Славуціч, Багданаў, Фіялкін, Фрэнкель, Малей і Галкоўскі

Фінплян 4-га кварталу—выканаць

БССР выканала фінплян трэцяга кварталу на 87,4 проц. Гэта значыць, што прамысловасьць і будаўніцтва не атрымала неабходнага фінансавага падмацаваньня, што 12,6 проц. недавыкананьня пляну паслужылі значнай прычынай слабасьці работ на паасобных вучастках.

Недавыкананьне пляну трэцяга кварталу зьявілася вынікам недаацэнкі гэтай работы паасобнымі організацыямі, якія неўразумелі таго, што фінплян—неадлучная частка промфінпляну, што ад выкананьня фінпляну залежыць выкананьне вытворчых плянаў.

Перад чацьвертым кварталам пастаўлены вялікія задачы. Чацьверты квартал павінен завяршыць трэці рашаючы год пяцігодкі. На працягу чацьвертага кварталу павінна скончыцца будаўніцтва 518 і 1040.

Гэта значыць, што неабходна забясьпечыць поўнае выкананьне фінансавага пляну чацьвертага кварталу, мобілізаваць усе сілы на гэты ўдарны вучастак.

Пастанова Камісіі выкананьня, якая была апублікавана гэтымі днямі ў друку, адзначыла нездавальняючае становішча з выкананьнем фінансавага пляну па Савецкай Беларусі. Побач з выкананьнем ашчадных плянаў, дрэнна пастаўлена работа па рэалізацыі падпіскі на пазыку „трэці рашаючы“

Пазыка па Савецкім Саюзе рэалізавана на 1.267.333 тысячы рублёў, што складае 115,3 проц. заданьня. У асноўным кампанія па рэалізацыі падпіскі скончана.

Але асноўнаю задачаю зараз зьяўляецца афармленьне падпіскі і збору чарговых узносаў. Трэба разумець, незамацаваная падпіска,—падпіска—нерэальная. І тут мы сустракаемся з такім становішчам, што гэта праца праходзіць міма ўвагі, гэтаму не надаюць належнай увагі. У выніку па Савецкім Саюзе аформлена 1.051.413 тысяч рублёў, або 82,9 проц. усёй прынятай падпіскі. На Беларусі падпіска аформлена толькі на 78,1 проц.

Такі процант афармленьня падпіскі яўна недапушчальны.

Зараз перад комсамолам Беларусі паўстае задача—выканаць соцдагавор з Украінай. Дагавор прадугледжвае барацьбу за рэалізацыю і афармленьне падпіскі.

Адначасова з гэтым неабходна дабіцца, каб фінансавы плян чацьвертага кварталу быў выкананы, каб былі створаны патрэбныя ўмовы для ліквідацыі запазычанасьці трэцяга кварталу. У свой час комсамол кінуў значную колькасьць сваіх членаў на барацьбу за выкананьне бальшавіцкага фінпляну. Неабходна праверыць стан ашчадных кас і замацаваць іх лепшымі комсамольцамі—ударнікамі.

Неабходна ліквідаваць нядоімкі па ўсіх відах плацяжоў, асаблівую ўвагу зьвярнуўшы на ЖАКТЫ, дзе нядоімкі за кватэрную плату асабліва вялікія.

Вопыт і ініцыятыва комсамольцаў заводу „Комунар“ павінна стаць набыткам усёй комсамольскай організацыі. Соцыялістычнае страхаваньне павінна атрымаць з радоў комсамолу дзесяткі і сотні ўдарнікаў на гэтым фронце.

Фінплян чацьвертага кварталу павінен быць выкананы. Мобілізаваць увагу комсамолу і рабочай моладзі на барацьбу за замацаваньне падпіскі, за лепшую працу ашчадных кас, за поўную ліквідацыю нядоімак, за соцыялістычнае страхаваньне—у гэтым задача дня, і гэтага патрабуе задача выкананьня ўдарных плянаў чацьвертага кварталу.

Беспартыйныя на чале кіраўніцтва бюро ячэйкі

Некаторыя комсамольскія ячэйкі чыгуначнага вузла ст. Магілеў з-за непрацаздольнасьці бюро ячэек і адсутнасьці кіраўніцтва бюро колектыву і РК ЛКСМБ не адчуваюцца на вузьле, Так, бюро ячэйкі пры дэпо зусім не займалася пытаньнем асеньня-зімовых перавозак. Сэкратар ячэйкі да апошняга часу ня ведаў, хто сэкратар партыйнай ячэйкі дэпо. Ня дзіва, што ячэйка не працуе. У бюро абраны людзі, якіх даўно выключылі з комсамолу і такія, што ў комсамоле ніколі ня былі.

Рашэньні партыйных і комсамольскіх організацый аб перабудове транспорту, прамова тав. Сталіна большасьцю ячэек вузла таксама не абгавораны.

Брыгадзір „ЧЗ“ і „К. Б.“
Шалькевіч

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

Нездавальненьне соцыял-дэмократычным кіраўніцтвам

БЭРЛІН. 7. Учора ў Брэслаўлі на масавым камуністычным мітынгу, на якім выступіў комдэпутат рэйхстагу т. Рэвэ ў компартыю падалі заяву 127 рабочых. Сёньня ў комсамол уступіла 4 члены саюзу соцыялістычнай моладзі. З усіх рабочых цэнтраў паступаюць паведамленьні аб нездавальненьні радавых соцыял-дэмократычных рабочых політыкай соцыял-дэмократычнага кіраўніцтва ў адносінах да „белай“ опозыцыі,

Зноў вінаваты „нібыта комуністыя“

БЭРЛІН. ТАСС. Сёньня ноччу ў Бэрліне невядомымі асобамі разьбіты шыбы ў 21 аддзяленьні буйнейшых выдавецтваў Ульштэйна. Некаторыя буржуазныя газэты выкарыстоўваюць гэты выпадак для кампаніі супроць компартыі, сьцьвярджаючы, што нападалі нібыта комуністыя і што камні, якім разьбівалі шыбы, былі закручаны ў паперу з надпісамі „Далоў забарону „Ротэ Фанэ“.

Яшчэ 300 тысяч кінутых на галодную сьмерць

БЭРЛІН. (ТАСС). Згодна рашэнню дзяржаўнага кіраўніцтва па страхаваньню ад беспрацоў'я, пэнсія беспрацоўным будзе выдавацца не больш чым у працягу 20 тыдняў, тады як дагэтуль беспрацоўныя мелі права атрымліваць пэнсію на працягу 26 тыдняў.

Сэзонныя рабочыя будуць атрымліваць пэнсію толькі на працягу 15 тыдняў. Гэта мерапрыемства пазбаўляе дзяржаўнай пэнсіі звыш 300 тысяч беспрацоўных.

Ніводнага граша польскім катам

ПАРЫЖ. Орган комсамолу Францыі „Авангард“ публікуе адозву да рабочых моладзі і ў прыватнасьці да соцыялістычнай моладзі, заклікаючы яе да супольнай кампаніі солідарнасьці з політычнымі зьняволенымі ў Польшчы. Кампанія павінна весьціся пад лёзунгам: „Ніводнага граша катам польскага пролетарыяту. Найхутчэйшае ўдаленьне з польскай арміі французскіх афіцэраў і служачых“.

За абарону рабочага нэгра-кулі

НЬЮ-ЁРК 7. У Кіўлэндзе поліцыя страляла па тысячным натоўпе беспрацоўных, якія не дапускалі высяленьня з кватэры сям'і рабочага нэгра. Адзін рабочы нэгр забіты і трое паранена. Паранена таксама двое паліцэйскіх, 11 рабочых арыштаваны.

Ангельскія маракі перамаглі

ЛЁНДАН. Урад пайшоў на значныя ўступкі ў пытаньні аб зьніжэньні ставак маракам ваеннага флёту.

Тыя разрады маракоў, якім спачатку было прапанавана зьнізіць стаўкі да 3 шылінгаў у дзень, будуць атрымліваць 3 шылінга 8 пэнсаў у дзень. Іншыя разрады маракоў, стаўкі якіх былі зьніжаны да 4 шылінгаў 4 пэнсаў, будуць атрымліваць 4 шылінгі 9 пэнсаў.

Стыхійныя выступленьні сялян у Гішпаніі

МАДРЫД, 9. Стыхійныя выступленьні гішпанскіх сялян працягваюцца. Учора ў Віле (правінцыя Куэнка) сяляне захапілі землі памешчыкаў.

Будаўніцтва фабрыкі-кухні пад пагрозай зрыву

Заціхла праца на рыштаваньнях, спынены будаўнічыя работы

Хто вінаваты у гэтым? Будаўніцтва фабрыкі скончыць у тэрмін!

Аб гэтым сёньня 11 кастрычніка, а 5 гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ склікаецца нарада, на якую запрашаюцца наступныя таварышы: Васэрман, Будзько (Белстройаб'яднаньне), Дайч (Менстройаб'яднаньне), Бэрэнштэйн, Гершунін (Менкантора Белснабу), Ляўко Ляшчынскі (п/будова ГПУ № 2), Якабсон (ЦКК РСІ), Штытман, Гутнер (Дзяржплян), Канопік гарком комсамолу), прадстаўнік пракуратуры.

Просьба да вышэй адзначаных таварышоў зьявіцца абавязкова і своечасова.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“

17 кастрычніка ў эфіры загавораць чыгуначныя вузлы.

Комсамольскія колектывы Віцебску, Воршы і Гомеля будуць расказваць аб сваёй барацьбе за выкананьне плянаў асеньня-зімовага патоку, спаранай язды, аб выкананьні праграмнай прамовы т. Сталіна.

Праверце яшчэ раз радыёпрыёмнікі. Роўна а 8 гадзіне слухайце перадачу.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ і „Комсамольца Беларусі“.

Перавыкананьнем пляну заключнага ліквідаваць запазычанасьць трэцяга кварталу

Комсамолія Слуцкага і Смалявіцкага раёну дрэнна змагаецца за выкананьне фінпляну

Падхапіць пачын комсамольцаў „Комунара"

З пастановы Камісіі выкананьня пры СНК БССР аб выкананьні фінпляну Беларускай ССР, Ніжня-Волскім краем і Заходняй вобласьцю

Выкананьне фінансавага пляну Беларускай ССР і асабліва Ніжня-Волскім краем і Заходняй вобласьцю праводзіцца нездавальняюча.

Камісія выкананьня асабліва адзначае, што пры ўзмацненьні тэмпаў выкананьня фінансавых заданьняў у 3 квартале, у прыватнасьці па Беларускай ССР, пры датэрміновым выкананьні радам раёнаў кантрольных фінансавых заданьняў пляян мобілізацыі сродкаў ня выконваецца.

Мясцовыя організацыі, у тым ліку і фінансавыя, не ўдзялялі выстарычальнай увагі паступленьню плацяжоў сельскага насельніцтва, дзеля гэтага выкананьне пляну мобілізацыі сродкаў на вёсцы значна адстае ад гораду.

Камісія выкананьня ўказвае на неабходнасьць усямерна ўзмацніць работу на адстаючых вучастках, у прыватнасьці па звароту сельска-гаспадарчых пазычак (БССР, Заходняя вобласьць).

Асабліва зварочваецца ўвага СНК БССР, выканкому Заходняй вобласьці на невыкананьне ва ўстаноўлены тэрмін заданьняў па спагнаньню з кулацкай часткі вёскі сельска-гаспадарчага падатку.

Канстатуючы наяўнасьць у БССР выпадкаў выдаткаваньня сродкаў, адпушчаных на капітальнае будаўніцтва, не па простым прызначэньні (Белторг), няправільную практыку некаторых аддзяленьняў Дзяржбанку (Аршанскае), якія пералічваюць на эксплёатацыйныя рахункі сумы што адпушчаны банкам доўга тэрміновага крэдыту на капітальнае будаўніцтва, прапанаваць Саюзторгу і дзяржбанку наклясьці спагнаньне на вінаваных, устанавіўшы ў далейшым належны кантроль за выдаткаваньнем сум, якія адпушчаны на капітальнае будаўніцтва.

Варашылаўцы, прымайце выклік!

Бюро комсамольскага колектыву заводу „Комунар", заслухаўшы інформацыю брыгадзіра ЦСПСБ і ЦП саюзу ФБР аб фінэстафэце і ўлічваючы важнасьць выкананьня заданьня на колектыўнаму страхаваньню жыцьця ў справе фінансаваньня соцбудаўніцтва, пастанавіла ахапіць усіх комсамольцаў заводу „Комунар" колектыўным страхаваньнем жыцьця, разгарнуўшы шырокую растлумачальную працу і ахапіўшы падпіскай усіх рабочых і служачых заводу.

У выніку растлумачальнай працы па цэхавых ячэйках ужо ахоплена страхаваньнем 200 комсамольцаў (ліцейны, сьлясарны, кавальны токарны і бляшаны цэх)

Выклікаем комсамольскі колектыў заводу „Варашылава" пасьледваць нашаму прыкладу.

Бюро комсам. колект. заводу „Комунар".

Ліквідаваць прарыў мінулага кварталу

Слуцкі р-н ня выканаў фінплян 2 кварталу.

МТС і райкалгассаюз выканалі плян рэалізацыі акцый Трактарацэнтру на 7,1 проц., ашчадкаса—на 28, 4 проц., райспажыўсаюз—на 29,7 проц. Самаабкладаньня паступіла 52,5 проц. пляну.

Ня лепш і ў горадзе. Гарадзкая страхоўка сабрана на 53 проц.

Хаця на раёне ў цэлым пазыка рэалізавана на 100,5 проц., у наасобных сельсаветах вялікае недавыкананьне. Так, Шашгнёскі с-с рэалізаваў пазыку на 28 проц., Палікарпаўскі—на 49 проц., Усерскі—на 52 проц. Яшчэ горш з афармленьнем падпіскі. Паасобныя колгасы афармілі толькі 40 проц. падпіскі.

Патрэба зараз-жа організаваць работу такім чынам, каб у апошнім квартале 3-га рашаючага ліквідаваць прарывы мінулага кварталу.

Янка Прыбытак

Сельсавет адмаўляецца спагнаць падаткі з кулакоў

Фінплян 3-га кварталу Смалявіцкі раён выканаў на 53,3 проц. Асабліва дрэнна з выкананьнем пляняў паявых узносаў. Райспажыўсаюзу выкананьне 42 проц. Ня лепш на райколгассаюзах і МТС. Пляны рэалізацыі акцый Трактарацэнтру выкананы на 46,5 проц.

Райкоопсаюз сабатуе рэалізацыю машынных абавязацельстваў,—рэалізавана толькі 1,4 проц. пляну.

Асабліва ганебна адстае Пятровіцкі сельсавет, які выканаў план па сельскагаспадарчаму падатку на 3,5 проц. Прэзыдыум сельсавату адмовіўся спагнаць з кулакоў падаткі.

Комсамольская організацыя на чале з райкомам амаль нічога не прадпрымаюць дзя выкананьня фінпляну.

Г. Хваёвы

Раўняцца па комсамолу Аршаншчыны і Магілеву

Баявы разгон рабоце ва ўдарны трохдзёньнік

Дзесятага адходзіць першы комсамольскі Рэдакцыі „Чырвонай Зьмены"

МАГІЛЕЎ. 9-Х, Першы комсамольскі эшалён бульбы Ленінграду адпраўляем 10 раніцай. Эшалён забясьпечан кандуктарскімі і паравознымі комсамольскімі брыгадамі, якія павядуць цягнік да месца прызначэньня.

Рыхтуем адгрузку другога комсамольскага эшалёну.

Райкамол ЛІЎШЫЦ
Брыгадзір „Ч. З." ШАЛЬКЕВІЧ

Комсамол Мазыра павінен ліквідаваць прарыў

МАЗЫР. Уборка бульбы па Мазырскім раёне праходзіць нездавальняюча: выканана 27,4 проц. пляну. Колгасы выканалі 12,8 свайго пляну, аднаасобнікі 31,9 пр.; фэрмы ЦРК не пачыналі капаць.

Комсамол павінен выступіць у бой за тэрміновае сканчэньне уборкі. Бульбу—у цэнтр комсамольскай увагі! За ўдарны трохдзёньнік ліквідаваць прарыў! (Белта)

Узяць ударныя тэмпы

Колгас Сталіна (Клічаўскі раён) к 10-му кастрычніка павінен быў скончыць выбарку бульбы і адгрузіць 40 тон рабочым цэнтрам. Аднак, дзякуючы дрэннаму кіраўніцтву праўленьня, дрэннай арганізацыі працы, капаць бульбу колгас пачаў толькі 3-га кастрычніка. Работа вядзецца слабым тэмпам. Уборка бульбы не пераведзена на здзельшчыну. У выніку колгас накапаў і здаў толькі 8 тон бульбы.

За абвесткаю ЦК КП(б)Б і СНК БССР трохдзённік уборкі і адгрузкі бульбы ліквідаваць прарыў!

Явар

Адгрузіць Ленінграду 100 тон

МАЗЫР. 8-Х. Адгрузка бульбы Ленінграду праходзіць на грунце соцспаборніцтва і ўдарніцтва, пры вялікім ўздыме колгасьнікаў і аднаасобнікаў. Чырвоныя абозы колгасьнікаў



і аднаасобнікаў Ліпанскага сельсавету пад кіраўніцтвам партячэйкі 5-га кастрычніка адгрузілі Ленінграду 100 тон бульбы. Другія сельсаветы павінны раўняцца па Ліпанскім сельсавеце. (Белта)

У тэрмін убраць і адгрузіць

МАГІЛЕЎ.—Райспажыўсаюз, райкоопсаюз і аддзяленьне Белплодгароднінцы праяўляюць поўную бяздзейнасьць у загатоўцы і адгрузцы бульбы пролетарскім цэнтрам. К 7-му кастрычніку замест 30 вагонаў адгружана толькі 5.

У апошні час шэфскія організацыі-прадпрыемствы, комсамол і школы разгарнулі шырокую работу па трохдзеньніку сканчэньня ўборкі і адгрузкі бульбы. Работа праходзіць пад лёзунгам: К 15 кастрычніка—„ніводнага кілё бульбы на полі".

На аснове соцспаборніцтва прадпрыемствы, установы, комсамол і школы гораду паслалі на дапамогу колгасам і саўгасам звыш 2 тысяч чалавек. Першымі ідуць рабочыя 3-х чыгунбуду, якія адпрацавалі 600 працадзён і абавязаліся адпрацаваць 1050 працадзён, студэнты політэхнікуму і педтэхнікуму. Завод „Адраджэньне" гарбарня імя Сталіна і швейная фабрыка не дапамагі саўгасам і колгасам на ўборцы бульбы.

Адстаючыя, вазьмеце раўненьне на перадавых! (Белта)

Увазе Камісіі выкананьня пры СНК БССР

МЫ АБВІНАВАЧВАЕМ

аддзелы кадраў ВСНГБ, Белметалаб'яднаньня, Швэйаб'яднаньня, Тэкстыльаб'яднаньня і Белкоопсаюзу —

яны вінаваты ў зрыве будаўніцтва і забясьпечаньня віцебскіх ФЗВ

Пры пабудове новых фабрык у Віцебску ні адна гаспадарчая организацыя не будавала своечасова памяшканьняў для ФЗВ. Ужо даўно працуе буйнейшая фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі", але да апошняга часу Белшвэйаб'яднаньне не прыступіла да будаўніцтва ФЗВ. 500 вучняў ФЗВ швэйнікаў знаходзяцца ў былой сынагозе. Гэта памяшканьне ні па якасьці, ні па колькасьці жылое плошчы не забясьпечвае добраякаснай пастаноўку вучобы.

Пабудавана новая панчошная фабрыка, аб будынку-ж для ФЗВ Белтэкстыльаб'яднаньне забылася. У выніку—сыстэматычны недабор вучняў, бо нехапае інтэрнатаў, няма пакояў для вытворчага навучаньня.

Тое-ж самае паўтараецца і пры будаўніцтве шчотачна-шчаціннага комбінату.

З-за апортуністычных адносін гаспадарчых аб'яднаньняў да будаўніцтва ФЗВ ні адзін ФЗВ у Віцебску не мае памяшканьня для заняткаў і інтэрнату.

Па віне гаспадарчых арганізацый сёлета не праведзена капітальнага будаўніцтва ні ў адным ФЗВ. Уся „работа" вылілася ў пошукі „вольных" памяшканьняў. ФЗВ металістаў пасяліўся ў клюбе якога да не было для заняткаў. ФЗВ павінен рыхтаваць фрэзероўшчыкаў, але ніводнага фрэзарнага варштату няма.

Увесь набор фабзавучу кулінараў з-за адсутнасьці памяшканьня распушчан да зімы. Аддзел грамадзкага харчаваньня ЦРК адмаўляецца праводзіць капітальнае будаўніцтва.

Немагчыма скончыць пачатае будаўніцтва будвучу, бо Белбудаб'яднаньне не пераводзіць адпушчаныя на гэта грошы.

Сарваўся набор 40 чал. у фабзавуч „Дзьвіна"—няма інтэрнату, хаця грошы ў сакавіку месяцы пераведзены дырэкцыі фабрыкі.

Сродкі на капітальнае будаўніцтва ФЗВ цыгунчыкаў і краўцоў сыстэматычна пераносяцца з году ў год, а будаўніцтва не пачынаюць.

Віцебскі гарсавет таксама ўдзяляе мала ўвагі капітальнаму будаўніцтву ФЗВ.

Мы неаднаразова зьвярталіся ў гарком КП(б)Б і інш. організацыі па гэтаму пытаньню і ніякіх практычных вынікаў не дабіліся.

Аддзелы кадраў усіх гаспадарчых організацый на чале з ВСНГ упарта не жадаюць выконваць пастанову ВСНГ СССР і СНК СССР аб капітальным будаўніцтве. Мы просім камісію выкананьня пры СНК БССР заняцца гэтай справай і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве падрыхтоўкі соцыялістычных кадраў.

Шапіра

Комплектаваньне ФЗВ нездавальняючае

4-га кастрычніка пры Наркомпрацы БССР адбылася нарада па пытаньню аб ходзе асеньняга набору ў ФЗВ. Нарада адзначала зусім нездавальняючае комплектаваньне школ у асеньні набор. Прынята ўсяго 49,5 проц.

Нарада асабліва падкрэсьліла адсутнасьць масава-палітычнай работы вакол набору, недастатковае асьвятленьне ходу комплектаваньня ў друку.

Нарада пастанавіла прасіць ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ працягнуць да 20-га кастрычніка дэкаду штурму па ўкомплектаваньню ФЗВ асеньнім наборам.

Падкрэсьлена неабходнасьць шырока популярызаваць пастанову СНК БССР ад 3-га кастрычніка аб мерапрыемствах па аздараўленьню ўмоў працы падлеткаў у прамысловасьці і школах ФЗВ.

Нарада прапанавала ўсім гаспадарчым організацыям выканаць пастанову НКА СССР аб перадачы падлеткаў, занятых у прамысловасьці на некваліфікаваных работах, у школы ФЗВ.

Даручана ўсім інспэкцыям працы і кіраўніцтвам кадраў прасачыць за выкананьнем ўсіх дырэктыў па комплектаваньню школ ФЗВ.

Крэсьцьянінаў і Лявіцін зрываюць дарожнае будаўніцтва

Пляны дарожнага будаўніцтва на 3-й дыстанцыі ў пагражаючым стане. Разьбіўка каменю, рассыпка шчэбеню ў карыта, падвозка пяску зараз рашаюць у выкананьні пляну. Гэта патрабуе ад адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу дыстанцыі надзвычайнай гнуткасьці, асабліва ў правільнай расстаноўцы рабочай сілы. Аднак на будаўніцтве наглядаюцца барскія адносіны, а часам і упартае нежаданьне паасобных працаўнікоў організаваць працу.

Так, інжынэр Крэсьцьянінаў і тэхнік Лявіцін амаль сарвалі суботнік, організаваны партыйна-комсамольскай ячэйкай Хутарскага сельсавету 28-9. На суботнік выехала 250 падвод, з якіх працавала 150 і то бяз поўнай нагрузкі толькі таму, што гэтыя таварышы адчынілі ўсяго тры кар'еры для вывазкі баласту, замест 8-9.

Аналёгічныя зьявы наглядаюцца і на лініі трасу, дзе з-за нераспарадчасьці гэтых кіраўнікоў зачынены варонкі і ў дажджы ва многіх мясцох размываецца дарога.

Дзесятнік 2-га вучастку тав. Бялевіч адзывае рабочых з камнядрабілкі і перакідае на іншую работу, дзе рабочыя зусім не патрабны.

Усе гэтыя недахопы гавораць бязумоўна аб нясумленных адносінах да працы паасобных таварышоў і зьяўляюцца вялікай перашкодай у выкананьні пляну будаўніцтва.

Адпаведныя організацыі павінны зараз-жа прыняць самыя рашучыя захады для ліквідацыі гэтых агідных фактаў, дабіўшыся пералому ў рабоце.

Выязная рэдакцыя „Чырвонай зьмены" і „Комсамольца"

КРОЎ, ЛАНЦУГІ І КРАТЫ...

Трашчаць устоі фашысцкай Польшчы пад напорам працоўных мас, ЯК ІХ ВЯДЗЕ КОМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ

Эканомічны крызіс ў самай яркай форме выступае ў сучасны момант у Польшчы.

Буйнейшыя заводы і фабрыкі польскай прамысловасьці зачынены. З кожным днём зачыняецца ўсё большая колькасьць фабрык і заводаў.

Статыстыка налічвае больш за 100 тысяч беспрацоўных.

Армія беспрацоўных штодня павялічваецца.

Адна толькі ваенная прамысловасьць працуе без перабояў, яна не адчувае крызісу.

Нясупынна падаюць цэны на сельска-гаспадарчыя продукты. На пшаніцу цэны палі на 22,7 проц., на жыта 20,7 на ячмень—21,9 проц.

Рабочыя буйнейшых цэнтраў прамысловасьці, як Дамброўскага вугальнага басэйну, Верхняй Сілезіі, трамвайшчыкі Варшавы, організавана выступаюць супроць эксплёатацыі і фашысцкага прыгнечаньня.

Па ўсёй Польшчы і Заходняй Беларусі палаюць памешчыцкія маёнткі.

Польскія сяляне пераходзяць ад стыхійных форм да організаванай барацьбы пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ.

Працоўныя масы ўсё больш і больш аб'ядноўваюцца пад сьцягамі компартыі і комсамолу Польшчы і Заходняй Беларусі, якія вядуць на барацьбу супроць здрадніцкай палітыкі ППС, супроць крывавай дыктатуры фашызму, супроць нападаў на Савецкі Саюз, за Савецкую Польшчу.

Задача комсамолу БССР—узмацніць сваю інтэрнацыянальную работу, матар'яльна дапамагчы польскім палітзьняволеным, трымаць шчыльную сувязь з замежнымі братэрскімі сэкцыямі.

„Правы" Польшчы на ўзброеньне

„Газэта Польска" у № 258 прыводзіць наступную інформацыю, прыгатаваную для лютаўскай конфэрэнцыі 1931 г. па разброеньню аб польскім узброеньні.

Польшча ўладае наступнымі ўзброеньнямі:

Морскі флёт: 2 кс. тарпэданосцы, з тонажам 8.080 тон, 3 падводныя лодкі—тонаж 2940 тон, 5 мінаносцаў, 2 канонэркі, 4 мінныя тралеры, 1 гідрографічны параход 1 транспортнае судно, 1 вучэбнае парусное судно, 6 рачных монітараў, 8 рачных патрульных лодак, 1 судно для школьнага навучаньня.

ПАВЕТРАНЫ ФЛЁТ: 346 баявых самалётаў і 354 вучэбных.

АСАБОВЫ СКЛАД: у морскім флёце—3.108 чал., з якіх офіцэраў—1.477 чал., матросаў 1609 чал., астатнія—у рэзэрве.

У ПАВЕТРАНЫМ флёце 7929 ч.: офіцэраў—677 чал., салдат 5144 чал.—астатнія ў рэзэрве.

СУХАПУТНАЯ армія—265.950 чал.: офіцэраў 51675 чал, салдат па прызыву 193.050, астатнія ў рэзэрве.

Акрамя таго: 26611 чал. у корпусе пагранічнай аховы, 31675 у дзяржаўнай паліцыі і 5985 у пагранічнай стражы.

Вайсковы бюджэт на 31-32 г. складае 847 мільёнаў злотых, з гэтай сумы—735.313.493 зл.—выдаткі на сухапутную армію, 34280000 зл. на—вайсковы флёт і 78006500—на паветраны флёт.

Ня гледзячы на гэтыя ўзброеньні, па словах інформацыі, Польшча ня мае намеру разброўвацца і лічыць, што мае права на яшчэ большыя ўзброеньні.

(„К. З.")

За савецкую нашу

Максім Лужанін

(З рэчы „Галасы гарадоў)

Асабліва вылучаецца ў справе катаваньня Копец, начальнік Пінскай турмы, садыст, у літаральным сэнсе гэтага слова". („Зьвязда")

Так...
За ўсё,
Што яны зароб-
бяць,
нам
крывёю
прынесьці за-
плату.
Я успомніў
маленькую дро-
бязь
нацыянал-дэмакратаў.
Прыпадаліся—
думкі,
мары,
сны
і
лятуні
урадоўцаў,
прэм'ераў—
з драбязы
Бэ-эН-эРый:
„Адарваць яе
трэба
ад Азіі,
ад вар'яцкіх утопій
бальшавіцкай фантазіі—
прылучыць
да Эўропы".
вус
Ў гэтай справе
пан Прыстар
нам вядомы
адыстар.
Ў гэтай справе
пан Копец
адукаваны
хлопец!
А дэнікінец
Юнчыц—
усіх гэтых скарынчыць.

Прылучэньне—
задужа простае
Толькі...
крышацца
косткі,
ды гумовыя
палкі—
у аскабалкі.
А калі не захоча
„далучацца"

рабочы,—
дык гаворыць
пан Копец—
лепшы майстар
і хлопец:
„Можна
воцату ў ноздры,
ды вастрэйшы
боль каб
пад пазногці
іголку,
Ад
савецкай атруты—
крохі
выкруціць рукі,
і,
з усьмешкаю тон-
кай,
размаджэрыць галёнкі.
Потым...
можна
і звольніць...
Папыталі
і даволі.
Калі-ж
моцна завые—
дык...
павесіць за шыю.
Хай
вышчэрвае іклы
з нашай
ласкі вялікай".

Там,
дзе умеюць
біць і маліцца,
выгандлёўваючы спажыву
называлася—
інквізыцыя,
называецца—
дэфэнзыва.
І за ўсіх
іх—
служкі хрысто-
выя
на крыжах
падымаюць
жаль.
І пакінуўшы
закатаваных
выяжджаюць паны
на баль.
Прысьпяшаючы
сваю
пагібель

кайданамі
і
бізуном,
лакаванымі
сваімі крагамі,
адлюстроўваючы
ў іх ноч.
І за тое,
што нам
яна
родная,
што заўсёды
няврушна
з намі—
расьпінаецца
там
Заходняя
крыважэрлівымі
панамі
Там—
набэрсваюцца ану-
чыны,
вострыць штых
партызанская варта
І сягоньня
адзін
замучаны
ў мільён
вырастае
заўтра
І калі
бары
разгудуцца
аж
прыназемліваючыся
на пясок;
чуй!
гартуецца рэволю-
цыя
у сутарэньнях
і па лясох.
Нам—
адразу
паліць
паходні ўсім!
Кроў-жа выбухне—
ня іначай—
за
ўкатованую
за
Заходнюю
за
Савецкую
н а ш у

1) „Галасы гарадоў" друкуюцца ў часопісу „Узвышша".

ПОЛЬСКАЯ ВЁСКА СЁНЬНЯ

Окупацыйна-колёніяльная палітыка польскага імпэрыялізму на Заходняй Беларусі неміласэрна разбурае сотні тысяч бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак вёскі.

У той час, калі бяднейшыя пласты вёскі церпяць страшэнную нэндзу, голад і бязьзямельле, гостка польскіх і беларускіх абшарнікаў і кулакоў ўладае вялізарнейшымі плошчамі пашы, лугоў, лесу. Амаль што тры чвэрці ўсёй зямлі ў Палесьсі, г. зн. 2 мільёны 190 тысяч га належыць горстцы памешчыкаў, а сотні тысяч сялян цесьняцца на няплодных, балоцістых кавалачках зямлі. Горстка абшарнікаў Навагрудзкага ваяводзтва ўладае больш 900 тысяч га, тады як 500 тысяч сялян (улічваючы і сем'і) гэтага ваяводзтва уладаюць мізэрнымі ковалачкамі зямлі ў 2-3 дзесяціны. Сюды трэ' яшчэ дадаць страшэнны ўціск фашысцкага ураду, які ўскладае на сялян непасільныя падаткі, штрафы шарваркі і інш.

Комасацыя зямлі (гэта значыць абяднаньне раскіданых кавалкаў у адно цэлае і потым дзяльба сярод сялян) дае вялікую выгаду толькі кулакам, якія ў змове з фашысцкім ўрадаўцамі абкрадаюць беднякоў, замяняючы лепшыя кавалкі зямлі на горшыя накладаючы вялікую плату за скасаваньне плошчаў, за вымеры гэтых плошчаў і г. д.

Сяляне вёскі „Пучына", Пінскага павету, дзе нядаўна была праведзена гэтая комасацыя, расказваюць:... „Жабракамі нас зрабілі. 20 кулакоў, падкупіўшы інспэктара, узбагаціліся з нашай добрай зямлі, а нам—65 беднякам і сераднякам—далі самыя найгоршыя пяскі З жабрацкай торбаю застаецца нам пайсьці Цяпер нам у дзесяць разоў горай, чым перад гэтым.."

Комасацыю фашысцкі ўрад Пілсудзкага праводзіць па ўсёй Польшчы асабліва на Заходняй Беларусі.

...ўсё больш масавых [боек, стыхійных выбухаў і вострых форм барацьбы аж да партызанскіх выступленьняў, паданыя ў студзеньскіх рэзолюцыях ЦК КПЗБ, цалком пацьвярджаюцца разьвіцьцём падзей у Польшчы і Заходняй Беларусі.

(Рэзолюцыя 5-га пленуму ЦК КПЗБ).

Усё часьцей і часьцей сяляне адмаўляюцца плаціць падаткі. Так, сяляне раду вёсак Волчынскага раёну на агульных сходах прынялі рашэньне не плаціць падаткаў, ня выходзіць на шарваркі. Яны пішуць:... „Калі ў адну з вёсак (гэтага раёну) прыехаў сэквэстратар з 2-мя паліцыянтамі і пачаў забіраць за неаплачаныя даўгі маёмасьць, дык сяляне, сабраўшыся ўсёй вёскаю, засыпалі паліцэйскіх каменьнем. Сэквэстратар выклікаў на дапамогу атрад паліцыі. Сяляне, барацьбою якіх кіравалі комуністыя і комсамольцы, паслалі ў суседнія вёскі „чырвоных ганцоў" з паведамленьнем аб здарэньні. Сяляне суседніх вёсак у знак солідарнасьці зараз-жа зьявіліся на дапамогу сваім братом. Пачалася бойка з паліцыяй. У выніку упартай барацьбы, у час якое было паранена некалькі паліцэйскіх і некалькі сялян, паліцыю ўдалося прагнаць з вёскі".

У помсту за гэройскае выступленьне сялян, азьвярэлыя фашысцкія каты паслалі карную экспэдыцыю. Пачаліся масавыя арышты і забіваньне сялян. Ва ўсім раене разьвярнулася нясупынная барацьба супроць белага тэрору, за аслабаненьне 17 арыштаваных сялян. У выніку гэтай масавай барацьбы ўсе 17 арыштаваных былі звольнены.

Баявы рэволюцыйны пачын волчынскіх сялян супроць фашысцкіх окупантаў не прайшоў дарма, з іх бяруць прыклад іншыя вёскі, раёны і мясцовацьці Заходняй Беларусі

Сяляне Ліцчыцкага раёну, дзе ў 3-х вёсках на ліцытацыю аддадзены ўсе гаспадаркі за выключэньнем кулацкіх, таксама адмовіліся плаціць падаткі і прагналі сэквэстратара і 12 паліцэйскіх. Хваля барацьбы сялян з сэквэстратарамі і паліцыяй супроць збору падаткаў пракацілася і па Гэгаз ольскім, Уладаўскім, Смаргоньскім, Маладэчанскім, Гарадзецкім і інш. раёнах.

Сяляне гэтак сама вядуць барацьбу і супроць шарваркавых работ (формавых работ). Вось, што пішуць аб гэтым сяляне:

...„ Па дарозе паміж Янавам, Волчынам і Высока-Літоўскім праводзяцца шарваркі. Першай адмовілася выходзіць на работы вёска Залесьсе. Тры разы прыходзілі туды шарваркавыя наказы, але сяляне на работу ня вышлі. Ні пагрозы ўрадавых чыноўнікаў, ні штрафы, ні арышты,—нішто не дапамагло: сяляне трымаюцца стойка",

У вёсцы Прыборава, Ула аўскага раёну ўра прысл ў быў шарваркавыя наказы (ад дзесяціны 2 дні працы). Сяляне на сваім сходзе аднагалосна заявілі: „Ня хочам сваім потам дапамагаць фашысцкім катам рыхтаваць вайну супроць нашых братоў!"

Хваля выступленьняў супроць шарваркаў масава разьліваецца па ўсей Берасьцейшчыне.

Ня гледзячы на ўсе праследваньні фашысцкае ўлады, ня гледзячы на карныя крывавыя экспэдыцыі, сяляне Зах. Беларусі пад кіраўніцтвам компартыі і комсамолу вядуць нясупынную, гэроічную барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры, супроць падаткаў, шарваркаў, комасацый, ліквідацыі сэрвітутаў, супроць рабунку сялянскай зямлі.

Владэк.

СУСТРЭЧА ПА ЗАСЛУГАХ

Сяляне Волчынскага раёну выганяюць з вёсак паліцыянтаў, якія прышлі забіраць маёмасьць у сялян

... апошнім непазьбежным боем закончаны будзе круг барацьбы

Так, па офіцыйных зьвестках, комасацыя зямлі праведзена сёлета ў 8-10 разоў большая, чым за апошнія гады.

А вось і другі спосаб рабунку бядняцкай зямлі, больш нават зладзейскі, чым комасацыя, гэта—ліквідацыя сэрвітутаў (сэрвітуты—гэта карыстаньне дзяржаўнымі лясамі, лугамі, — бязумоўна, частковае).

Дзеля таго, каб зьліквідаваць сэрвітуты, урадавыя чыноўнікі і абшарнікі займаюцца хітрыкамі і ашуканствам. Яны падкупляюць кулакоў тэй ці іншай вёскі, атрымліваюць бязумоўна, ад кулакоў згоду і, ня пытаючыся ў вясковай грамады, ліквідуюць сэрвітуты. Такім чынам былі зьліквідаваны сэрвітуты ў 7 вёсках Маладэчанскага і Косаўскага паветаў.

Абшарніцкая зграя, вядучы наступ на сялянства, учыняе самыя ганебныя гвалты, каб адабраць ці то пашу, ці кавалак лесу, каб забраць апошнюю магчымасьць пасьвіць жывёлу, зьбіраць апал, ягады, грыбы і г. д. у сэрвітутных мясцовасьцях.

Так, напрыклад, у вёсцы Боркі Слонімскага павету беднякі—сяляне пасьвілі авечкі на сэрвітутнай пашы абшарніка Пратасевіча. Абшарнік паклікаў паліцыянтаў. Сяляне сабраліся бараніць сваё дабро. Паліцыя зьбівала іх багнэтам; адну жанчыну цяжка параніла, а пастуха закавалі ў кайданы. Абшарнік пры дапамозе паліцыі забраў усіх авечак.

Па меры ўзмацненьня наступу азьвярэлага фашызму на окупаваных і прыгнечаных сялян, усё больш расьце нездавальненьне сялян да існуючага фашысцкага ўраду. Гэта нездавальненьне выліваецца ў вастрэйшыя формы клясавай барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры.

... „Пэрспэктывы высокага рэволюцыйнага напружаньня, разгортваньня...

„Правда":

МАГНІТАГОРСК 8. Сёньня, а 4-й гадзіне 30 хв дня пастаўлены на сушку 69 печаў 7-й батарэі коксахэмкомбінату.

„Труд"

МАГНІТАГОРСК На домне № 1 укладзена апошняя цэгла. Брыгады кладчыкаў Басалаева, Міціна ўпарта змагаліся за кладку печы, разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва.

„За Індустрыялізацыю":

МАГНІТАГОРСК 8. Сёньня задымаліся другая труба коксахэму. Растоплена другая батарэя кокса-печаў № 1.

Увесь Савецкі Саюз пільна сочыць за гіганцкім будаўніцтвам Урала-Кузбасу.

Ці падрыхтаваны ты да радыё-апавяданьня аб ходзе будаўніцтва, організаванага „Комсомольской правдой"?

Правер сваю падрыхтаванасьць.

Памятай: радыё-апавяданьне пачнецца заўтра а 20 гадзіне.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" і Беларускае аддзяленьне „Комсомольской правды".

Новыя катаржныя прысуды

ВАРШАВА. Акруговы суд у Навагрудку (Заходняя Беларусь) вынес прыгавар па справе 24 абвінавачаных у прыналежнасьці да компартыі.

22 абвінавачаныя прыгавораны ў агуле да 66-ці гадоў катаржнай турмы. 3-е з іх прыгавораны да 5 год, 4—да 4-х, 5 да 3-х год катаржнай турмы.

Протэстуем супроць нячуваных зьдзекаў

Мы, старшыні кол асаў Лепельшчыны, сабраўшыся ад імя 50-тысяч калгасьнікаў, выносім свой рэзкі протэст супроць белага тэрору над палітзьняволенымі ў Польшчы

У адказ мы бярэм на сябе наступныя абавязкі: організаваць ва ўсіх калгасах МОПР'аўскія ячэйкі, дзе іх яшчэ няма, сваячасова здаць дзяржаве хлеб, бульбу, лён і г. д.

Рэйд юнкораўскай брыгады „Ч. З."

ЗАГАТОЎШЧЫКІ НА ХВАЛЯХ САМАЦЁКУ. КУЛАК САБОТУЕ

Комсамол Рагачэўшчыны збожжазагатоўкі лічыць неабавязковай работай

Збожжазагатоўкі ў Рагачэўскім раёне праходзяць яўна нездавальняюча. На 1-е кастрычніка гадовы плян выканан на 24,8 проц. Загатоўчыя організацыі Райснаб і Саюзхлеб, спадзяючыся на самацёк, не перабудавалі работу па-опэрацыйнаму і зьяўляюцца выключна прыёмшчыкамі збожжа на ссыпных пунктах, ня ведаючы як сельсаветы выконваюць плян.

Сельсаветы таксама не забясьпечылі ўдарных тэмпаў збожжазагатовак. Члены сельсавету і камісіі садзейнічаньня збожжазагатоўкам нічога ня робяць. Райколгассаюз і колгасы плян здачы дзяржаве таварных лішкаў збожжа выконваюць дрэнна. Колгасны сэктар на 1-е кастрычніка выказаў плян толькі на 19,5 проц.

Зусім ня ведаюць Райснаб, Саюзхлеб і сельсаветы як выконваецца цьвёрдае заданьне кулацка-заможнымі гаспадаркамі. Калі брыгада запыталася ў старшыні райснабу Кучынскага, аб тым, які проц. цьвёрдага заданьня выканан на 1-е кастрычніка, Кучынскі адказаў: „Ня ўсе сельсаветы даслалі зьвесткі, а таму проц. нам не вядомы".

Мадарскі сельсавет меў заданьне спагнаць з кулацка-заможных гаспадарак 109,10 цэтнераў збожжа, спагнаў-жа на 1-е кастрычніка толькі 10,25 цэнт. Крушынацкі сельсавет замест 186 цэнтнэраў спагнаў 22,14. Запольскі сельсавет замест 234 цэнт. спагнаў 74.

Кулак саботуе збожжазагатоўкі, не выконвае цьвёрдыя заданьні ва ўстаноўлены ўрадам тэрмін, а сельсаветы ня ўжываюць ніякіх мер.

Райснаб і Саюзхлеб ня ведаюць якая колькасьць тары ім патрэбна.

—„Пакуль што тары хапае, а там можа падашлюць з цэнтру",— так заявіў брыгадзе загадчык складам Саюзхлеба Бычкуноў.

Пры такім стане збожжазагатовак, Рагачэўская комсамольская організацыя павінна была-б па-баявому ўзяцца за выкананьне дырэктыў партыі, аднак райком комсамолу і рад комсамольскіх ячэек для збожжазагатоўчай кампаніі палец аб палец ня выцялі. Комсамольскія ячэйкі колгасаў „Першамога", „Молат" (М.-Страўкоўскага сельсавету), „Друць" (Азяранскі сельсавет) „Перадавы" (Куранскі сельсавет) і г. д. нічога канкрэтнага па збожжазагатоўках не зрабілі. Сэкратары ячэек лічаць, што ўдзел у збожжазагатоўках—не абавязковая работа комсамолу.

Райком комсамолу толькі гэтымі днямі мяркуе абгаварыць на бюро пытаньне аб удзеле ў збожжазагатоўках. Масава-політычнай работы ў сувязі з загатоўкамі комсамольская організацыя не праводзіць.

Райком комсамолу і ўся рагачэўская комсамольская організацыя абавязаны пакончыць з опортуністычнай недаацэнкай збожжазагатовак. Зараз-жа па-баявому мобілізаваць усю організацыю на ўдарнае выкананьне збожжазагатовак.

К 1-му лістапада гадовы плян збожжазагатовак раёнам павінен быць выканан ня менш як на 65 проц.

Прымусіць кулака і заможніка ў мінімальна кароткі тэрмін поўнасьцю выканаць цьвёрдае заданьне.

Ударнай работай ліквідаваць прарыў, нагнаць прапушчанае! Організаваць бесьперапынную істужку здачы дзяржаве збожжа.

Брыгада: Рабаў А.
Шынкевіч М.

Шасбуд

1. Так пачынаецца гісторыя

Дзіўныя людзі—казаў ён, зацягваючыся пахкім дымам цыгары.—У нас, на Захадзе, робяць рэчы ня горш за вашыя, і гэта ня лічыцца гэройствам.—Недаўменна пацiскаючы плячыма, ён падаўся ўсім сваім тулавам да стала і худымі пажагрычвымі пальцамі страсянуў з цыгары попел.

—Так,—згадзіўся я.—У вас робяць рэчы, робяць ня дрэнна. Але, каб абвяргаць мае аргумэнты, вы павінны ўлічыць усе магчымыя хады,—вы-ж гулец добры. І вось якраз тут вы выпусьцілі з-пад увагі асноўнае ў нашай размове. У нас, у Савецкім Саюзе, робяцца рэчы, але разам з выпрацоўкай рэчы—робяць сыстэму рэчаў, новую ва ўсёй гісторыі цывілізаванага чалавецтва, соцыялістычную сыстэму. Шмат зроблена для таго, каб наша краіна пазбавілася векавое цемры, што дасталася нам у спадчыну ад царызму, але выкарчоўка гэтае спадчыны—штука непамерна цяжкая, штука складаная. Ёсьць людзі, якія як і вы, забываюць на гэтую існасьць нашае работы. А існасьць якраз вось і знаходзіцца ў тым, што разам з вытворчым процэсам рэчы у нас адбываецца вытворчы процэс выпрацоўкі новай катэгорыі людзей, выпрацоўкі новай—я-б сказаў: соцыялістычнай—псыхолёгіі гэтых людзей. Мы кажам: ня толькі рэч—продукт таго ці іншага вытворчага процэсу, а мэта, для якое робіцца гэтая рэч. А вам зразумела, што мэта будзе дасягнута тым хутчэй, чым лепш будзе зроблена рэч.

Гэтая размова з замежным інжынэрам паўстала ў маёй памяці менавіта тады, калі прысутнічаў я на комсамольскім сходзе шасбудаўцаў.

Ішоў вечар: слізкі, укамплектаваны дажджом і ветрамі вечар, тыповы для восені. Ішоў вечар, і таму тут—у пакоі—быў шызаваты змрок (і быў ён яшчэ больш ад моцнага настою цыгарковага дыму). Пайшлі некуда на сяло па газоўку, пайшлі, бо абслугоўчыя організацыі не палічылі за патрэбнае даць комсамольскаму інтэрнату такую „раскошу", як газоўка.

Сход ішоў у цемры. Але раней, чым прывязуць газоўку і зноў—з новай энэргіяй—будзе ісьці сход я хочу расказаць аб тым, чаго ня відаць з-за адсутнасьці сьвятла. Я хочу расказаць аб інтэрнаце. Іх я бачыў шмат. Але гэты (у ім зьмяшчаюцца дваццаць сем мобілізаваных на Шасбуд комсамольцаў) уразіў мяне сваім выглядам. Некалі—здаецца у „Крокодиле" бачыў я таленавітую карыкатуру. На ёй было: з бліскучым праборчыкам і з такім-жа портфэлем стаіць чалавек, ён—відаць толькі-толькі адчыніў дзьверы і ў нос яму сыпнуў цяжкі пах, аж зьвяло ноздры.

— А клапоў у вас няма?

— Ды што вы?! Хіба такая далікатная жывёла на вытрымае?—прыблізна такі быў зьмест карыкатуры.

Тут у шасбудаўскім інтэрнаце клапоў няма. Але разам з тым няма і сяньнікоў, салома скрозь заслала нары і падлогу (і адразу цяжка зразумець: дзе-ж, уласна кажучы, сьпяць людзі).

Ідзе сход. Шмат тут комсамольцаў. Гэта моцныя хлопцы, напорыстыя і ёмкія. Прыехалі яны сюды штурмаваць прарыў на Шасбудзе: біць каменьне, развазіць пясок, рассыпаць яго, пракладаць, гнаць простую, як пояс, сашу: апаясваць паясом гэтым Беларусь Савецкую.

—І колькі разоў на сходах казалі аб гэтым,—кажа комсамолец.—А рады няма! Вось хлопцы адвязвалі шэсьць сяньнікоў—яны і ёсьць А нас-жа дваццаць сем чалавек!

Адтуль з-пад сьцяны, дзе асабліва цесна ад народу чуецца голас:

— Вось зноў-жа, таварышы аб сталоўцы... Прывязуць абед а добра ня ўлічаць, колькі людзей, потым і не хапае. Мяса часьцяком не дадаюць.

— От быў такі выпадак. Чакалі чакалі на абед, яго а гадзіне шостай прывезьлі. Толькі мы ла катла аж вячэра падасьпела. Што тут зробіш?

Шмат тут комсамольцаў. Шмат у іх крыўд, і крыць трэба тых, хто парушае чалавечы оптымум іхнага бытаваньня. Крыць трэба, і крыюць здорава, па-комсамольску крыюць, па-бальшавіцку. Вось вызоў чалавек. У яго шмат упартасьці ў абліччы—абурана кажа:

— Прэміяваць цяпер будуць. А як-о? Вось казалі, што Гарэцкай бацінкі даюць, а хіба ў нас лепшых няма? Мы ведаем такіх ударніц, як Гарэцкая. Насыпе на воз пяску, хлапцоў насаджае і скаліць зубы.

— А хто гэта прэмію бяз нас выдаваць будзе? Жартуеце, хлопцы! Як-жа так бяз сходу?

Паветра—пяжэй і цяжэй: ад накуранага дыму, ад безьлічы гарачых чалавечых цел, ад галасоў—упартых, быстрых думак, гэтымі галасамі выказаных.

—Робіш, робіш, а колькі зробіш—ты ведаеш? Месяц працуем, а ўлiку ніякага няма, ніхто ня ведае, хто колькі зрабіў.

—Нормы потым няма...

Але вось—праз шматлікія скаргі, праз абурэньне, праз рогат і іронічныя заўвагі, вось праз усё гэта:—

А прарыў?!

І вось тут, адкідаючы ўсё ліхое і благое, гэтыя людзі напружваюць нэрвы, гэтыя людзі—суцэльны комсамольскі масыў.

—Ёсьць, хлопцы, прапанова разаслаць ліст па нашых колгасах, да сваіх за дапамогай зьвярнуцца. Дапамогуць зьліквідаваць прарыў.

—Быць ня можа—дапамогуць!

Аж успацеў хлопец, чытаючы ля цьмянае газоўкі тэкст ліста ў свае колгасы.

Ідзе зіма. На трэцяй дыстанцыі Шасбуду прарыў. Комсамольцы другога вучастку заклікаюць усё працоўнае насельніцтва, усіх колгасьнікаў Чэрвеньшчыны—выйсьці на дарогу, аддаць дарозе два дні, нагнаць страчанае, зьліквідаваць прарыў.

—Аднагалосна,—кажа старшыня сходу.

Так пачынаецца гісторыя.

Геноссе Сорж! Я ня ведаю, ці трапіць да вас гэты запіс, зроблены ў падарожным блёкноце. Але я ўпэўнен: калі трапіць—вы зразумееце, якія рэчы, якую сыстэму рэчаў робіць наша пакаленьне, вы зразумееце, што нашы людзі—вясёлыя і бойкія хлопцы, радасьць якіх—праца для стагодзьдзяў, а праца гэтая—гонар, мужнасьць, гэройства.

Барыс Мікуліч

Чэрвень—Шасбуд 5-X 31 г.

21 ДЗЕНЬ ПАДРЫХТОЎКІ

„З мэтай стварыць пералом у правядзеньні беларусізацыі, пленум пастанаўляе з 1 лістапада правесьці 2-хмесячнік агляду стану і правядзеньня беларусізацыі ў комсамоле і савецка-дзяржаўным апараце" (З рэзолюцыі 3-га пленуму ЦК ЛКСМБ)

Дні, што засталіся да 2-хмесячніку, зрабіць штурмавымі днямі падрыхтоўкі

Больш 2-х месяцаў як апублікавана рэзолюцыя 3-га кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ па дакладу тав. Рубенчыка пра ход выкананьня рашэньняў X і IX-га зьездаў ЛКСМ аб удзеле ЛКСМБ у нацкультбудаўніцтве.

Рэзолюцыя гэта павінна адыграць вялікую ролю ў ліквідацыі адставаньня комсамолу на фронце нацкультбудаўніцтва.

Комсамольскія камітэты і колекты вы павінны былі на грунце гэтай рэзолюцыі мобілізоўваць комсамольскія організацыі для яшчэ больш актыўнай барацьбы на фронце нацкультбудаўніцтва, бо кантрольны пленум яскрава падкрэсьліў, што побач з некаторым паваротам ЛКСМБ да вырашэньня важнейшых задач, „цэлы рад важнейшых пастаноў зьезду ЛКСМБ яшчэ ня выкананы.. Пленум разглядае адсутнасьць работы па беларусізацыі як няўменьне ўзяць бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні беларусізацыі ў той ці іншай організацыі, як нядольнасьць кіраўніцтва мобілізаваць масы комсамолу на правядзеньне ленінскай нацполітыкі. Пленум прапануе усім організацыям у бліжэйшы час дабіцца пералому у выкананьні рашэньняў зьезду па беларусізацыі".

Гэткая ацэнка работы комсамолу на вучастку нацкультбудаўніцтва, гэткая ацэнка кіраўніцтва, гэткая прапанова пленуму „усім організацыям у бліжэйшы час дабіцца пералому ў выкананьні рашэньняў зьезду па беларусізацыі" павінна была прымусіць кіраўнікоў комсамольскіх камітэтаў, колектываў і ячэек задумацца над станам беларусізацыі ў іх колектывах.

Аднак, з часу пленуму і па сёньня комсамольцы яшчэ зусім слаба аўладалі і карыстаюцца белмовай, зусім дрэнна ведаюць гісторыю і экономіку БССР.

Мы ведаем, што за апошні час тэмпы барацьбы за аўладаньне белмовай, гісторыяй і экономікай БССР не толькі ня ўзьняты, але ў некаторых мясцох нават значна паслаблі.

—Возьмем дзеля прыкладу 3 буйнейшыя раёны: Гомель, Віцебск і Менск. Калі раней тут шмат гаварылі аб беларусізацыі, дык зараз нават і гаварыць перасталі. Кожны беларусізуецца як хоча і можа. Гурткі па вывучэньню белмовы пры заводзе „Ланцуцкага" і некаторых іншых распаліся з-за дрэннага кіраўніцтва. Вопыт „варашылаўцаў" у організацыі ўдарных брыгад па прыкладному вывучэньню белмовы не падхоплен яшчэ як належыць ніводнай комсамольскай ячэйкай, ніводным колектывам, ніводным камітэтам.

Гомельскія, віцебскія і менскія гаркомаўцы, замест дабіцца лепшага і хутчэйшага вывучэньня і ўжываньня белмовы, самі не карыстаюцца ёю ў штодзённым ўжытку. Гаркомаўцы яшчэ ня ведаюць ні гісторыі ні экономікі БССР.

X зьезд ЛКСМБ яскрава адзначыў „зьезд лічыць неабходным ўжываньне і вывучэньне белмовы кожным комсамольцам".

Ці выканана гэта пастанова X-га зьезду? Цалком яшчэ не выканана. Шмат комсамольцаў не вывучаюць і не карыстаюцца белмовай. На заводах „Ланцуцкага", „Сельмаш", „Пралетары", „Рухавік рэволюцыі" (Гомель). „Дрэваапрацоўшчык", „Варашылава", „Комунар" і г. д. комсамольцы на мове...

У Белкоопсаюзе, МЦРК, ГЦРК і ВЦРК гавораць па расійску. Комсамольскія ячэйкі гэтых установаў вадочна зусім дрэнна змагаюцца за вывучэньне і ўжываньне белмовы.

На менскай ф-цы „Кастрычнік" дрэнна ажыцьцяўляецца пастанова ЦК КП(б)Б і ЛКСМБ аб вывучэньні белмовы, экономікі гісторыі БССР. Тут некаторыя гора—„тэорэтыкі" лічаць што „рабочыя фабрыкі гавораць па-расійску, а не па-беларуску таму, што яны яўрэі".

Такому яўна няправільнаму тлумачэньню комсамольскі колектыў ня даў належнага адпору. Гурткі белмовы не працуюць, хоць і складзены.

Комсамольскі колектыў заводу „Полымя рэволюцыі" у апошні час не вядзе ніякай барацьбы з ігнараваньнем белмовы на заводзе.

Фактаў ігнараваньня дырэктыў партыі ў галіне хутчэйшага ажыцьцяўленьня беларусізацыі хоць адбаўляй.

А беларусізацыя — асноўнае зьвяно ў агульным ланцугу бязьлітаснай барацьбы партыі і комсамолу за ажыцьцяўленьне нацпалітыкі.

Кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ, адзначыўшы, што „пленум разглядае адсутнасьць работы па беларусізацыі як няўменьне ўзяць бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні беларусізацыі ў тэй ці іншай організацыі, як нядольнасьць кіраўніцтва мобілізаваць масы комсамолу на правядзеньне ленінскай нацполітыкі", рашыў: „з мэтай стварыць пералом у правядзеньні беларусізацыі, пленум пастанаўляе з 1-га лістапада правесьці двухмесячнік агляду стану і правядзеньня беларусізацыі ў комсамоле і савецка-дзяржаўным апараце. Мэтай гэтага агляду павінна быць поўнае ўжываньне і вывучэньне белмовы кожным комсамольцам. Няма ніводнага прадпрыемства бяз гуртка па вывучэньні белмовы, гісторыі і экономікі Беларусі".

Толькі 21 дзень застаўся да пачатку 2-х месячніка агляду стану і правядзеньня беларусізацыі ў комсамоле і савецка-дзяржаўным апараце, але комсамольскія організацыі не разгарнулі шырокай масавай падрыхтоўкі да яго.

Так далей быць ня можа.

Неабходна зараз-жа ўзяцца за організацыю па ячэйках, колектывах, прадпрыемствах, цэхах і агрэгатах ударных брыгад па вывучэньню мовы, гісторыі і экономікі БССР, каб ва ўсеўзброеньні спаткаць 2-х месячнік.

Комсамольскія камітэты павінны зараз-жа прыступіць да організацыі брыгад якія-б у час месячніку ня толькі правяралі стан беларусізацыі, але і дапамаглі конкрэтна наладзіць гэтую работу.

Цішка Верны.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ.

МК і колектыў супрацоўнікаў Выдавецтва „Чырвоная Зьмена" выказвае сваё глыбокае спачуваньне тав. Л. Шышкову з прычыны сьмерці яго маткі.

Усім колектывам і ячэйкам ЛКСМБ г. Менску

Сёньня 11 кастрычніка а 7 гадз. увечары ў доме навукі і тэхнікі склікаецца першая агульна-гарадзкая конфэрэнцыя плянава-опэрацыйных груп г. Менску з наступным парадкам дня:

1. Даклад тав. Бондара — плян 1932 году.
2. Работа плянава опэрацыйных груп на прадпрыемстве. у цэху і брыгадзе:
3. Рознае.

На конфэрэнцыю запрашаюцца: экономісты плянавікі, працаўнікі плянавых аддзелаў прадпрыемстваў, спэцыялістыя і працаўнікі Дзяржпляну НДІ, ВСНГБ. Менгарком ЛКСМБ.

Дом Пісьменьніка (Савецкая, 68)

12-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары творчы вечар

Андрэя Александровіча

Тав. Александровіч прачытае новую п'есу.

Пасьля чыткі—абгаварэньне.

Запрашаюцца рабочыя літаратурныя гурткі, актыў заводзкіх комсамольскіх колектываў, пісьменьнікі, студэнты.

Уваход вольны.

Сэкратарыят МенАПП.

12 кастрычніка 1931 г., роўна а 6-й гадзіне ўвечары (у памяшканьні ЦК ЛКСМБ—Карла Маркса, 3) адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму ЦКК ЛКСМБ, на якое выклікаюцца наступныя таварышы: Мытнік П. М., Цьвірко А. К., Цельга L, Бэрнштэйн, Кохна Н. С., Шнітман, Гіндзін Д. Л., Верабей М., Адынец З. П., Славікоўскі Я., Харытончык У. Р., Кантаровіч М., Баброў А., Бляхэр В. С., Падалек А. А., Прус. Шчурко М. А., Гладкі Н., Пятухоў, Ганестаў В. В.

Праезд за свой кошт

Адказны сэкратар ЦКК ЛКСМБ СКАБЛО

Стара-Барысаўскі Сьвінагадоўчы Тэхнікум

аб'яўляе прыём на 9-ці месячныя курсы тэхнікаў сьвінаводаў

Пачатак заняткаў 25 кастрычніка

Без іспытаў прымаюцца маючыя адукацыю ня ніжэй 6 клясаў сямігодкі

Патрэбны дакуманты: аб соцстановішчы, праве голасу, аб узросьце, адукацыі і здароўі

Пажаданы рэкомэндацыі і камандыроўкі. Умовы вучобы: усім стыпэндыя 85 руб. і інтэрнат

Заявы падаваць г. Барысаў, Стара-Барысаўскі с. г. тэхнікум

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.